Слова для Жыцця (117)

Аўтар: Рэдакцыя
29.05.2016 00:00



Папа Францішак

Быць хрысціянінам – азначае, перш за ўсё, не прыналежнасць да пэўнай культуры ці паслушэнтва пэўнай дактрыне, а, хутчэй, злучэнне свайго жыцця ва ўсіх яго аспектах з асобай Езуса, а праз Яго – з Айцом. З гэтай мэтай Езус абяцае спасланне Святога Духа на сваіх вучняў. Менавіта дзякуючы Святому Духу, Любові, якая злучае Айца і Сына і паходзіць ад Іх, мы ўсе можам жыць жыццём самога Езуса. Дух навучае нас неабходнай рэчы – любіць так, як любіць Бог.

“Regina Caeli” са Святым Айцом, 15.05.2016 †



Кс. бп Аляксандр Кашкевіч

Калі мы паглядзім уважліва на сучасны свет, то з лёгкасцю заўважым, які ён нешчаслівы, як моцна патрэбны яму супакой. Гаворка ідзе не толькі аб такіх няшчасцях, як войны, стыхійныя бедствы, тэрарызм, злачыннасць, беднасць, сацыяльная няроўнасць. Нешчаслівыя таксама і грамадствы, якія не ведаюць войнаў, жывуць у дабрабыце, прагрэсе, цешацца найноўшымі дасягненнямі навукі і тэхнікі. У многіх багатых, добра развітых краінах статыстыка паказвае пастаянны рост лічбы самазабойстваў, дэпрэсій, розных залежнасцей. Прычыны гэтага розныя, але адна з іх, магчыма, найважнейшая – тое, што сучасны чалавек часта адварочваецца ад Бога, забывае аб Ім або ў пысе і асляпленні думае, што Бог яму не патрэбны, бо ён у стане сам,

без Бога збудаваць сабе рай на зямлі.

Фрагмент гамілii, прамоўленай падчас Дыяцэзіяльных дзён моладзі ў Мастах



Кс. абп Тадэвуш Кандрусевіч

Калі мы навучымся прабачаць у сям'і, то падобна будзем рабіць і ў жыцці. Можа, некаторыя скептычна ставяцца да такой прапановы, але яна выпрабавана жыццём. Святы Айцец Францішак кажа, што кожны акт прабачэння змацоўвае сцены сямейнага дома, якія патрэскаліся. Практыка прабачэння ў сям'і не толькі лечыць саміх яе членаў, але і чыніць іх здольнымі дапамагаць грамадству на шляху да дасканаласці, каб яно было лепшым.

Здольнасцю прабачыць сям'я не толькі ратуе сябе, але і ўносіць бясцэнны ўклад у сведчанне аднаўляючай моцы Божай міласэрнасці і прабачэння.

Фрагмент гамілii, прамоўленай падчас св. Імшы на I Кангрэсе сямейных рухаў